Ганна Красуліна застаецца жыць у Беларусі *(чытайце на 2-й стар.)*

На прастор, на шырокі разлог
Выхадзі, мой народ, грамадою...
Якуб КОЛАС

№ 101 (4353)

21 снежня 2018 г.
Выдаецца з ліпеня 1995 г.
на беларускай
і рускай мовах

Выдавец:
УП «Народная Воля».
Кошт — свабодны.

Народная Воля

Да ўвагі!
Хто хоча набываць газету ў офісе рэдакцыі — чакаем!

АКТУАЛИИ



Светлана КАЛИНКИНА

Люди в сером

Согласно официальной информации, прямо в милицейской машине повесился житель деревни Славково Несвижского района 48-летний Сергей Абрамович.

Милиция говорит, что повесился на собственных шнурках, зацепив их за решетку.

Но кто в это верит?

Эксперты объясняют, что такое возможно – именно поэтому у задержанных всегда отбирают шнурки: просто в данном случае Абрамовича не успели довезти до ИВС.

Но и в это не все верят.

Есть свидетели-односельчане, которые рассказывают, что прежде, чем уехать в сопровождении милиционеров, Сергей Абрамович сообщил, что «на этот раз в ЛТП все равно не поедет». То есть будто бы и намекал на самоубийство.

И все равно самоубийство под вопросом.

То есть мы достоверно не знаем, что на самом деле произошло в Несвижском районе – убийство или самоубийство. Но по реакции соцсетей видим, что на вопрос «Могли ли милиционеры убить человека, а потом представить это как самоубийство?» очень многие белорусы отвечают: «Да».

Министр внутренних дел Игорь Шуневич, впрочем, пытается всех убедить в обратном. Буквально в октябре этого года он же заявил телеканалу ОНТ, что «людей, которые не доверяют милиции, все меньше». Каких-то конкретных цифр министр не приводил, так что не исключено, что это его личные ощущения. Но ощущения и факты – это не одно и то же.

Я приведу факты.

Утром 16 мая все СМИ обошла фотография окровавленного троллейбуса в Гомеле, в котором милиционеры пытались задержать сбежавшего из колонии преступника. Тогда находившийся в розыске Никита Бас при задержании тяжело ранил трех сотрудников милиции, погоня длилась всю ночь, и надеть наручники на беглеца удалось только под утро, когда он пытался переплыть Днепр.

Успешная операция, о которой много писали и еще будут писать, потому что скоро суд. Но журнал «Милиция» сообщил интересную деталь, на которую мало кто обратил внимание. Оказывается, задерживали Баса в почти пустом троллейбусе, когда тот остановился возле универмага «Гомель». Сотрудники в штатском, крикнув «Стоять, милиция!», начали заламывать беглецу руки. Но в этот момент в происходящее вмешался посторонний мужчина. Это он – случайный нетрезвый пассажир полупустого ночного троллейбуса – принялся оттаскивать оперативника, который уже почти надел наручники на Баса. И хватило минутной заминки, чтобы преступник выхватил нож, которым сумел тяжело ранить трех милиционеров.

Посторонний человек отбивает преступника от милиционеров. Как это понимать? А понимать очень просто – слово «милиция» для многих людей, к сожалению, стало, будто красная тряпка для быка.

Другой пример. Из Бреста. Вечером 23 июля нетрезвый мужчина сидел на лавочке перрона брестского автовокзала в ожидании маршрутки. Не дебоширил, не скандалил. Просто сидел. Сотрудники ППС решили его «забрать». Вступились люди, просили отпустить человека, ведь он ничего плохого никому не делал. В итоге история переросла в серьезный конфликт. В РУВД попал не только нетрезвый путешественник, но даже сотрудница автовокзала, пытавшаяся его защитить...

Жабинка. Здесь в этом году конфликтом людей с милицией закончился День города. История типичная: милиционеры пытались задержать пьяного, люди стали пьяного защищать. В итоге, чтобы утихомирить толпу, пришлось вызывать ОМОН...

Опять Брест. В октябре этого года потасовкой между противниками строительства аккумуляторного завода и милицией обернулось задержание двух женщин, которые сидели на лавочке. Люди окружили милицейскую машину, требовали у милиционеров объяснений, пытались отбить задержанных, не давали их увезти. На подмогу прибыл ОМОН. В бессилии люди кричали ОМОНу: «Будьте вы прокляты!»

Примеры я могу продолжать. Их на самом деле много – случаев, когда обычные люди пытаются помешать милиции кого-то задержать. Почему так? Мы, простые граждане, все бандиты? Мы – за анархию, беззаконие, за то, чтобы преступники сбегали из колоний, а пьяные валялись на улицах городов?

Конечно нет. Просто нет доверия милиции, нет веры ей. Люди зачастую опасаются, что банальное задержание горького пьяницы может обернуться настоящей трагедией, и пытаются трагедии не допустить.

О чем говорят эти и многие другие факты?

О том, что белорусы вдруг перестали быть законопослушными?

Нет, не об этом.

О том, что люди в сером вышли из-под контроля закона. Понятно, это относится не ко всем, кто носит погоны. Но к очень-очень многим. Это им так много позволено и так много прощается, что люди больше не верят милиции, пытаются защитить друг друга от них.

А «доверие милиции – это показатель доверия власти». Последней фразой, между прочим, я процитировала все того же министра внутренних дел Игоря Шуневича.

P.S. Возвращаясь к трагедии, происшедшей в Несвижском районе, хочется задать еще один вопрос: что ж это за милиция, которая не смогла человека довезти живым до следственного изолятора?

ГАЗЕТА – ЧЫТАЧЫ

«Народная Воля» – з Вамі!

Каб мець магчымасць рэгулярна трымаць у руках свежыя нумары “Народнай Волі”, выйсце адно – падпісацца!

Шаноўныя сябры! Мы ўжо не раз паведамлялі: газета “Народная Воля” і аднайменны сайт рэдакцыі – розныя рэчы. Таму ўжо каторы месяц матэрыялы, якія друкуюцца на старонках выдання, выстаўляюцца ў інтэрнэт толькі праз два тыдні, для архіва, а не для аператыўнага азнаямлення. Для таго каб Вы ведалі, якія найбольш важныя матэрыялы змешчаны ў чарговым нумары, на сайце даюцца спецыяльныя анонсы.

Паўтараем: каб мець магчымасць рэгулярна трымаць у руках свежыя нумары “Народнай Волі”, выйсце адно – падпісацца! Калі Вы гэта зробіце па 26 снежня, то ўжо з 1 студзеня паштальёны будуць прыносіць Вам дахаты “Народную Волю”.

Прыхільнікаў “Народнай Волі” чакаюць ва ўсіх паштовых аддзяленнях, а мінчан – яшчэ і ў спецыялізаваных пунктах “Белсаюздруку”.

Вы – з «Народнай Воляй»,
«Народная Воля» – з Вамі!

СКАЗАНО!

Владимир МАКЕЙ,
министр иностранных дел Республики Беларусь:

«Белорусы на протяжении многих веков мечтали о независимости, поэтому сегодня страна просто обязана оставаться суверенной»

Так глава МИД Владимир Макей прокомментировал слова Дмитрия Медведева о «более углубленной интеграции».

– Я считаю, что, если спросить подавляющее число граждан нашей страны, они однозначно скажут, что Беларусь должна оставаться независимым и суверенным государством. Об этом суверенитете и независимости мы мечтали, думали на протяжении многих-многих веков. В нашей современной истории мы добились этого, поэтому мы должны и дальше работать над укреплением нашего суверенитета. Понятно, что, как говорит президент, это дорого стоит, но мы должны понимать это и должны сделать так, чтобы каждый вносил вклад в этот процесс – в укрепление нашего суверенитета, независимости и территориальной целостности, – сказал Владимир Макей после церемонии поднятия флага Министерства иностранных дел Беларуси.

Новый флаг МИД Владимир Макей назвал боевым знаменем и отметил, что сегодня ведомство не сражается на поле боя с оружием в руках, но дипломаты ведут баталии в политической, экономической, гуманитарной и иных сферах на международных площадках.

Напомним, на заседании союзного Совмина в Бресте премьер-министр России Дмитрий Медведев огласил условие, при котором Россия готова пойти на уступки по вопросу нефти и газа, – «более углубленная интеграция» в рамках договора о создании Союзного государства от 8 декабря 1999 года. Согласно документу, у стран должна быть единая валюта, единый суд, единая таможня, а также единый парламент.

Александр Лукашенко, комментируя слова Медведева, сказал, что «понимает эти намеки: получите нефть, но давайте разрушайте страну и вступайте в состав России», и заявил, что Беларусь никогда не войдет в состав соседнего государства.

Позже в Кремле заявили, что тема возможного объединения России и Беларуси в единое государство не обсуждается.

(TUT.by.)



ВЕЧНАЕ

Каб быць моцнымі, неабходна адрадзіць духоўную сілу

(З Пастырскага паслання арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча на Божае Нараджэнне 2018 г.)



Бог у чалавечым целе прыйшоў у гэты свет у Бэтлееме. Сёння, пасля дваццаці стагоддзяў, Ён таксама прыходзіць да нас.

А як жа мы самі? Ці гатовыя мы Яго прыняць?

Мы, людзі XXI стагоддзя, усё больш абмяжоўваючыся сваімі інтарэсамі, пошукам прыемнасцяў, імкненнем да ўлады і багацця, давяраючы дасягненням розуму, развіццю навукі і тэхналогіі, – ці можам мы з пакораю прыняць праўду ўцелаўлення Бога?

Ці можам дапусціць, што сярод нас з’яўляецца сам Бог? Гэтыя і падобныя пытанні ўзнікаюць кожны дзень.

Сучасны свет, а асабліва Еўропа, усё больш секулярызуецца, адмаўляецца ад Бога і хрысціянскіх каштоўнасцяў. Прымаюцца супярэчныя Божаму закону і духу Евангелля законы. Не шануецца Богам створаны інстытут сям’і. Самыя новыя дасягненні генетыкі выкарыстоўваюцца для маніпуляцыі з найбольш каштоўным Божым дарам, якім з’яўляецца дар жыцця. Вядзецца прапаганда згубнай гендарнай ідэалогіі, якая адкідае праўду аб тым, што Бог стварыў чалавека як мужчыну і жанчыну (пар. *Быц* 1, 27), і сцвярджае, што пол чалавека залежыць ад культурных абставін, у якіх ён жыве, і таму можа змяняцца. Гэтым самым яна пераварочвае Богам створаны парадак дагары нагамі. Парушаюцца прынцыпы сацыяльнай справядлівасці. Тэрарызм і гібрыдныя войны становяцца новай пагрозай. Вялікай праблемай з’яўляецца міграцыя. Сучасная культура і СМІ замест таго, каб умацоўваць духоўная каштоўнасці, іх абвяргаюць.

Свет перажывае нябачаны раней крызіс веры. У імя свецкасці завуалявана абмяжоўваецца яе публічнае праяўленне, і яна ўсё часцей зводзіцца да прыватнай сферы. Каб не абражаць, маўляў, пачуцці прадстаўнікоў іншых рэлігій ці культур, робяцца спробы стварыць уніфікаваную мадэль жыцця, выкараніць вядомыя і паважаныя ўсімі традыцыі, змяніць іх назвы, сімвалы ці месцы. У выніку разбураюцца асновы веры з мэтай абмежавання яе ў калектыўнай свядомасці; усё зводзіцца да неакрэсленых успамінаў пра традыцыю.

Сёння, калі Збаўца прыходзіць у наш беларускі Бэтлеем, услухаемся ў галасы анёльскіх хораў, якія абвяшчаюць хвалу Богу на вышынях і супакой людзям добрай волі. Яны спяваюць і на нашай зямлі.

Ці ў нас ёсць жаданне захаваць нашу хрысціянскую цывілізацыю ад знішчэння? Ці ў нас ёсць мужнасць бараніць нашу веру?

Можна мець добра развітую эканоміку, але калі мы не будзем жыць паводле духоўных каштоўнасцяў, то станем слабымі і безабароннымі. Каб быць моцнымі, неабходна адрадзіць духоўную сілу.

Не трэба забывацца пра тое, які вялікі і пазітыўны ўплыў на гісторыю чалавецтва і яго прагрэс аказала хрысціянства; як шмат яно ўнесла ў развіццё навукі і культуры, цывілізацыі любові і жыцця, гуманізму, абароны міру і сацыяльнай справядлівасці і г.д.

Віншую ўсіх вас з Нараджэннем Хрыстовым!

Віншую ўсіх людзей добрай волі!

Ад усяго сэрца жадаю ўсім вам поўнай супакою духоўнай пілігрымкі ў бэтлеемскую пячору і сустрэчы з Нованароджаным, які выклікае захапленне ад сузірання Яго святога аблічча.

Няхай дзякуючы таямніцы ўцелаўлення Бога наша Айчына стане Бэтлеемам XXI стагоддзя, каб у ёй кожны дзень праз сваю ласку нараджаўся Езус! Няхай Ён адорыць нас сваім супакоем! Няхай узбагаціць новай надзеяй, якая не толькі ў палітычнай ці эканамічнай свабодзе або ў рэформах, але перадусім у Богу! Няхай благаслявіць нас і вядзе шляхам Евангелля ў шчаслівую будучыню!

Беларусь, не бойся прыняць Езуса, бо ў Ім наша надзея і шчаслівая будучыня!

ПРАЕКТ

«Народную Волю» – для 600 бібліятэк!

Рады зрабіць другую справаздачу пра тое, як рэалізуецца наш дабрачынны праект **“Афармім падпіску на “Народную Волю” для 600 бібліятэк”.** У чарговы раз нагадаем, што пералічэнне грошай ідзе не толькі праз электронную платформу Talaka.org, але і праз разліковы рахунак непасрэдна рэдакцыі газеты. Мы вельмі ўдзячны ўсім, хто падтрымаў ужо нашу ініцыятыву і ахвяраваў пэўную суму на добрую справу. Дзякуй Вам, шаноўныя, вялікі дзякуй! Многія з Вас, як мы пісалі ў пазамінулым нумары, атрымаюць пазней спецыяльны нумар газеты “Народная Воля” з аўтографамі галоўнага рэдактара і вядомых аўтараў, кнігі знакамітых беларускіх пісьменнікаў з іх пажаданнямі. Помнім мы і пра наша абяцанне наконт кавы з галоўным рэдактарам, сняданку ці вячэры з любімым журналістам, фінансавага лікбезу ад прафесара, доктара эканамічных навук Барыса Жалібы, персанальнай вячэры ў нефармальнай абстаноўцы з галоўным рэдактарам Іосіфам Сярэдзічам.

На першую палову ўчарашняга дня налічвалася амаль 250 прэтэндэнтаў на 12 нашых намінацый. У агульным спісе значацца прозвішчы як тых, хто пералічыў грошы праз платформу Talaka.org, так і тых, хто перавёў фінансавыя сродкі непасрэдна на рахунак рэдакцыі газеты.

Інфармуем: усяго на падпіску на “Народную Волю” для 600 бібліятэк паступіла ўжо амаль **15.000** рублёў.

Асобы, якія пералічылі сродкі праз Talaka.org у апошнія дні:

Anna Severinets, Anastassia Kourtj, Юрый Губарэвіч, Олег Гайдукевич, Михаил Кузьмин, Екатерина Кр., Ганна Гайер, Иван Туля, Аляксей Герасіменка, Анонимный спонсор, Алесь Лагвінец, Инесса Черняк, Андрей Писарик, Владимир Джейгало, Анонимный спонсор, Игорь Каспер, Анонимный спонсор, Анонимный спонсор, Ирина Рабецкая, Анонимный спонсор, Анна Чирук, Зинаида Гончар, Natallia Dauzhenka, Анонимный спонсор, Анонимный спонсор, Иван Заборовский, Анонимный спонсор, Анонимный спонсор, Екатерина Медведская, Ala Vilchek, Илона Джейгало, Анонимный спонсор, Анонимный спонсор.

Асобы, якія пералічылі сродкі непасрэдна на рахунак “Народнай Волі” ў апошнія дні:

Николай Бурко, Вячеслав Рагойша, А.С.Сесицкий, Алена Дроздович, Мария Прихожая, Н.А.Какарека, Нина Ефименко, Валентина Байдак, М.В.Сидляревич, Мария Леонова, Татьяна Новоселова, Иван Мартюхов, Михаил Дятлов, Наталья Чернейка, В.Д.Дайнеко, Мария Озерская, Виктор Галиевский, Анна Цыганок, Петр Шилов, Елена Марецкая, Анонимный спонсор, Леонид Россиянский, Л.И.Коноплева, Ирина Кармановская, Антонина Мельникова, Михаил Тимошков, Леонид Березовский, С.В.Антонович, Михаил Шмарловский, Н.П.Ковалев, Валентин Кулик, Алексей Вильковский, Вячеслав Кунцевич, Олег Юзефович, Лидия Губич, Ольга Карпук, Анонимно (Гомельский ф-л РУП «Белпочта»), Иван Барцевич, Аркадий Галай, Алла Михайлова, Марат Малевич, Татьяна Кищук, Сергей Герасимчик, Зигмунд Севрук, Н.В.Одинцова, Петр Грицкевич, Николай Ганкевич, Зинаида Никитина, Людмила Белинская, Алексей Чернак, Наталья Ламинская, Н.Н.Былицкий, Алексей Воскобович, Леонида Дайлиденок, Алексей Слабодченко, Н.И.Жданович, Аноним (Витебский ф-л РУП «Белпочта»), Николай Шевчук, Зинаида Якимова, В.А.Дробница, Г.С.Желубовская, Серафима Тураева, Валентина Жирнова, Лев Митин, Павел Аленчик, Ольга Столярова, Станкевич, Анна Врублевская, Ева Иванцова, Александра Лобзова, Тамара Лобзова, Л.В.Немчинова, Виктор Богдель, Алексей Попков, Петр Макаров, Петр Колосов, Здислав Окуневич, Валентина Бич, Ирина Басалыга, Георгий Пасюк, В.В.Филипович, Антонина Демиденко, Светлана Пиласевич, Николай Зимин, Юрий Барышев, Р.В.Клавсуть, Татьяна Мазурина, Артем Давыдович.

Да заканчэння рэалізацыі праекта засталося яшчэ пяць дзён. Збіраць грошы на паўгадавую падпіску на “Народную Волю” для 600 публічных бібліятэк мы будзем **да 27 снежня**. Сума грошай, якую трэба сабраць, – **30.000** рублёў.

У чарговы раз нагадваем: ***калі вы маеце плацежную картку,*** то пералічыць грошы можна лёгка праз платформу Talaka.org, выкарыстоўваючы сістэму bePaid. Вам трэба толькі на сайце вызначыць суму, якую вы гатовы ахвяраваць, і ўвесці дадзеныя сваёй карткі.

Калі карткі няма, грошы можна пералічыць праз пошту альбо банк звычайным плацяжом з пазнакай “Праект”.

р/с BY08PJCB30120065351000000933
в «Приорбанк» ОАО, ЦБУ 113
BIC: PJCBBY2X
УНП 100961759

Дабрачынная акцыя працягваецца. Рады будзем, калі агульнымі намаганнямі зробім добрую справу. За бюджэтныя сродкі ў бібліятэкі нашай краіны трапляюць толькі дзяржаўныя газеты. А калі праект будзе паспяхова рэалізаваны, то ў іх чытальных залах з 1 студзеня 2019 года з’явіцца і “Народная Воля”, якая нясе слова **ПРАЎДЫ**, спрыяе павышэнню грамадзянскай актыўнасці, узнімае нацыянальную самасвядомасць. У канчатковым выніку – змяняе наша жыццё да лепшага.

Рэдакцыя газеты “Народная Воля”.

НУ І НУ!

Старшыня антыкарупцыйнай камісіі браў хабар алеем, курыцай і рыбай, пельменямі і нават марозівам

Разнастайныя факты карупцыі сярод мінскіх чыноўнікаў агучыў старшыня Камітэта дзяржбяспекі **Валерый Вакульчык** на нарадзе **Аляксандра Лукашэнкі** з актывам Мінска, інфармуе БЕЛТА.

Паводле яго слоў, кіраўніцтва горада стварыла добрае асяроддзе для карупцыі. Вакульчык згадаў затрыманне аднаго за адным кіраўнікоў галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку Мінгарвыканкама, у тым ліку былога намесніка мэра **Дамарацкага**. Яны, як заявіў Вакульчык, выбудавалі сістэму пабораў з камбінатаў школьнага харчавання і гандлёвых прадпрыемстваў сталіцы. У прыватнасці, са школьных сталовак бралі цвёрдую штомесячную таксу.

«Для гэтага дзецям змяншалі порцыі, перапрацоўвалі няз’едзеныя рэшткі ці проста мянялі рэцэптуру. У злачынную дзейнасць уцягнулі дзясяткі службовых асоб рознага ўзроўню», – распавёў ён падрабязнасці.

Згадаў старшыня КДБ і іншыя прыклады карупцыі. Напрыклад, аднаму з камерсантаў прадалі быццам бы незапатрабаваныя 64 кватэры. І замест мінчукоў, якія мелі патрэбу ў жыллі, недарагія кватэры на фармальна законных падставах куплялі набліжаныя работнікі ўпраўлення капітальнага будаўніцтва Мінгарвыканкама ды іх знаёмыя. «Прычым у большасці выпадкаў не для сябе, а для наступнага перапродажу з добрай маржой», – дадаў Вакульчык.

Дзеянні некаторых з чыноўнікаў ён назваў дробязнасцю і элементарным нахабствам. «Тыя ж кіраўнікі галоўнага ўпраўлення спажывецкага рынку рэгулярна наведваліся ў сталічны ЦУМ па тавары, не плацячы за іх. І ладзілі банкеты ў мінскіх рэстаранах за кошт падпарадкаваных прадпрыемстваў», – працягнуў пералічваць старшыня КДБ.

Прывёў ён і такі факт: адзін з кіраўнікоў раённай адміністрацыі сталіцы, які ўзначальвае тэрытарыяльную антыкарупцыйную камісію, кожны тыдзень па чацвяргах бясплатна атрымліваў прадуктовыя наборы з пэўнай сеткавай крамы. «Як быццам жыве ў галодныя часы дэфіцыту. Звычайныя рыба, курыца, алей, пельмені і нават марозіва – гэта набор штотыднёвага пайка чыноўніка», – абурыўся Вакульчык. Прычым заказы на тавары паступалі не толькі ад самога чыноўніка, але і ад яго жонкі, і ад іншых сваякоў.

ТОЧКА ЗРЕНИЯ



Александр ФЕДУТА

Запрет на общение с Богом

Протоиерей Сергей Лепин, чьими устами говорит Белорусская православная церковь Московского патриархата, заявил, что верующие православные белорусы не могут принимать участия в молебнах и других таинствах новосозданной Украинской православной церкви.

Меня это касается. По факту крещения я должен считать себя прихожанином БПЦ МП, и менять церковь я не могу: это было бы знаком неуважения к близким и дорогим мне людям, крестившим меня тогда, когда я этого еще не мог оценить и высказать свое отношение к происходящему. Но я помню и люблю и своего крестного отца, и крестную мать, и бабтю Катю, которая жила православной в католическом межвоенном Гродно и сохранила веру в том виде, в каком усвоила ее от родителей, до конца дней своих. Она и настояла на моем крещении – тайком от мамы, члена компартии, которая, конечно, была бы против.

Но и мама перед смертью исповедовалась по тому православному обычаю и тому священнику, который представлял наше ортодоксальное православие. Других церквей мы не знали, а потому и выбирать не могли. Да и смысла это особого в те времена не имело.

Сейчас церковный раскол коснулся меня.

Дело в том, что в Украине у меня много друзей. Некоторые из них уже сами достаточно преклонного возраста, у некоторых живы родители, и я их тоже знаю и люблю. Я не разговаривал ни с кем из них по поводу происшедшего объединения церквей, потому что считаю это слишком личным и болезненным вопросом. Но если вдруг кто-то из них умрет и я должен буду лететь на похороны, то следует ли из заявленного отцом Сергеем, что я должен спросить у отпевающего моего ушедшего навсегда друга, к какому именно патриархату он принадлежит? Если я окажусь в чужом городе в годовщину смерти или рождения близкого мне человека, то значит ли это, что я не могу поставить свечку в его память в храме, относящемся к ведению Украинской православной церкви, раз уж другого православного храма не будет поблизости?

Это не пустые вопросы, не словесная эквилибристика. Я не могу факт принадлежности храма или пастыря к другому ответвлению православия воспринять как факт отсутствия Бога в этом храме. И если мне нужно молча поговорить с Богом, я просто вхожу в храм, стою (если он православный) или сижу (в католическом) и думаю о нем. И о тех, кто ушел из моей жизни навсегда, чтобы продолжить свой диалог с Богом – без меня, но и за меня тоже.

Запрет на отправление таинств в каком-либо храме похож на отрицание самого факта вседприсутствия Бога. Я не знаю, что и кому он даст из людей мыслящих, что вызовет он, кроме недоумения, в их сознании. Этот запрет не разрешил для меня никаких вопросов – он лишь обострил их. И, думаю, не только для меня.

Когда-то владыка Филарет, ныне почетный патриарший экзарх всея Беларуси, сказал мне:

– Если вы задаетесь вопросом, что правильно, а что нет, значит, вы – верующий, хотя и не воцерковленный человек. Просто вы привыкли общаться с Господом сами. Когда-нибудь вам станет этого мало, и вы вернетесь в лоно церкви уже сознательно. Хотя и не уходили оттуда никогда, и сама церковь вас не отторгала.

Вот и сейчас я задаюсь вопросом: а правильно ли будет, если я не прощусь с ушедшим другом не в силу непреодолимых обстоятельств времени и расстояния, состояния здоровья или необходимости исполнить взятые на себя обязательства перед другими людьми, а потому, что действует запрет, наложенный на мои действия людьми, для которых жизнь проста и понятна и не предусматривает исключений из общего правила? Для них все просто.

Для меня, к сожалению, сложно. Жизнь сложней политической логики и политической этики отцов церкви и государственных мужей. И без этой сложности жизни как таковой нет. По крайней мере пока мы живы. Когда мы уйдем, все будет просто и понятно, и только Бог будет вправе судить, нарушили ли мы в реальности его запрет и заслуживаем ли мы наказания, – или же сделает для нас исключение. Мне кажется, он сделает исключение, даже если этих исключений будет очень много. Ибо Бог милостив, и, если мы нарушаем запреты патриарха, значит, Господь так захотел и позволил нам их нарушить.

И если мы это понимаем, он нас простит.

ГРОМКОЕ ДЕЛО

Высылка отменяется!

Суд Московского района Минска удовлетворил жалобу пресс-секретаря Объединенной гражданской партии Анны Красулиной на решение УВД о ее высылке из Беларуси и постановил отменить постановление УВД. За процессом в зале суда наблюдали шведский дипломат, сотрудники представительства Европарламента, американского и российского посольств, а также журналист «Народной Воли».

Как известно, 13 ноября миграционные службы страны приняли решение выслать Анну Красулину из Беларуси сроком на один год. Причина – три административных правонарушения, два из которых – участие в несанкционированных массовых мероприятиях, и одно – неоплаченный проезд в городском автобусе. В решении УВД была и такая фраза: «*Выслать в интересах общественного порядка*».

Анна Красулина – гражданка России, но живет в Беларуси и с 2002 года имеет вид на жительство в нашей стране. Она выпускница Московского государственного университета, ее муж – доцент, преподаватель Белорусского государственного университета, сын – аспирант, дочь – студентка. Однако, как следовало из милицейского уведомления, Анна представляет угрозу для общественного порядка. Адвокат Красулиной **Наталья Мацкевич** в суде прямо заявила, что такое определение – абсурд. Она ходатайствовала о приостановлении рассмотрения жалобы до вынесения решений Комитетом по правам человека ООН по обращениям Красулиной. Дело в том, что Анна была не согласна с тем, что ее привлекли к административной ответственности якобы за участие в несанкционированных мероприятиях, оспаривала это решение в белорусских судах, но, получив отказ, обратилась в Комитет по правам человека ООН. Однако это ходатайство судья **Ольга Гусакова** отклонила.

Сама Анна Красулина несколько раз повторяла в суде, что считает решение о высылке необоснованным и незаконным. Поясняла, что ей некуда ехать (единственный родственник за рубежом – это брат, который живет в Санкт-Петербурге, но с которым она



не поддерживает родственных связей), что у нее престарелые родители, за которыми она ухаживает. Муж Красулиной Евгений свидетельствовал в суде, что со своей скромной зарплаты доцента БГУ в 600 рублей не сможет содержать жену за границей и дочь-студентку.

Представитель УВД Московского района – старший инспектор отдела по гражданству и миграции **Филипп Карацюпа** заявлял в суде, что при вынесении решения были учтены все условия (например, за престарелыми и больными родителями Анны смогут ухаживать ее совершеннолетние дети), говорил, что высылка Красулиной – мера профилактическая («чтобы в будущем предотвратить последствия»). Карацюпа честно пояснил: «*Общих критериев нет, критерии избирательные. Не то что за безбилетный проезд ее выслали, а потому, что правонарушения были ранее. К каждому человеку применяются разные критерии. Мы также занимались изучением ее дела, чем она здесь занимается, что делает*».

Адвокат Наталья Мацкевич акцентировала внимание суда на еще одном моменте: в основу решения о высылке Красулиной легли документы для служебного пользования, которое Анне никто не показал. Наталья Мацкевич выступила с ходатайством, чтобы суд истребовал эти документы с УВД, и ходатайство было удовлетворено. Часть документов на следующее судебное заседание представитель УВД предоставил, но судья не стала с ними знакомить участников процесса. То есть для Анны Красулиной так и остались неизвестны истинные причины ее высылки. Хотя, возможно, это уже и не имеет значения. Анна остается в Беларуси! Именно такое решение приняла судья Ольга Гусакова 19 декабря. Хотя у стороны ответчика есть время на то, чтобы обжаловать это решение в суде высшей инстанции.

– Конечно, мы понимаем, что обжалование возможно, хотя это и маловероятно, – комментирует Анна Красулина решение суда. – Мой адвокат Наталья Мацкевич и представитель общественности от Белорусского Хельсинкского комитета, знаменитый адвокат **Гарри Погоняйло** были не просто убедительны – они наголову разбили представителей противной стороны. Они показали мастер-класс – как реально работают (должны работать) юристы в состязательном процессе. Вторая сторона, представлявшая интересы структур, принявших решение о высылке (ОГиМ Московского района и Департамент по гражданству и миграции), была, конечно, слишком слабой, чтобы соответствовать этому уровню. Наталья Мацкевич и Гарри Погоняйло легко и очень логично объяснили, почему решение о высылке является необоснованным, не отвечающим международным обязательствам Республики Беларусь, непропорциональным, несбалансированным, незаконным, абсурдным и в конечном итоге смехотворным. Но мы прекрасно понимали, как у нас принимаются решения. И в первый день судебного разбирательства все говорило о том, что решение будет не в мою пользу. А на второй день произошло чудо! Моя жалоба удовлетворена и высылка отменяется.

– Как вы это объясняете?

– Я думаю, что имиджевые потери страны в случае отклонения моей жалобы стали настолько реальными, что дешевле было откатить позорное решение УВД, чем потом объяснить, почему человека, имеющего семью и престарелых родителей, выслали из страны за непробитый талончик. Дело в том, что по двум другим административным правонарушениям, которые были положены в обоснование моей высылки, я подала обращения в Комитет по правам человека, отстаивая свои конституционные права на мирные собрания и свободу высказываний. И если решения комитета будут в мою пользу (что весьма вероятно), оснований для моей высылки не будет вообще...

Ситуация получалась крайне несимпатичная. А расхлебывать все это МИДу, который про это дело, инициированное силовыми структурами, хорошо, если узнал из белорусской прессы, а не от спецдокладчика Европарламента по Беларуси. Ведь волна, которая поднялась в белорусском гражданском обществе – среди правозащитников, журналистов, политиков, активных граждан, пользователей социальных сетей, достигла международных структур, и они начали активно запрашивать у белорусской стороны информацию о ситуации. Последовали заявления литовских парламентариев, запросы спецдокладчиков, высказался президент Европейской народной партии – крупнейшего объединения правоцентристских партий – **Жозеф Доль**. Говорят, дошло до того, что дело о моей высылке попало «на личный контроль» главы дипломатии ЕС **Федерики Могерини**…

– Анна, не могу не спросить: будете ли вы подавать документы на получение гражданства Беларуси?

– Судя по всему, да. Мы внимательно рассмотрим этот вопрос с коллегами и адвокатом. Беларусь – моя страна, а ОГП – моя партия.

– Членом которой вы не являетесь…

– Получив гражданство, конечно, первым делом оформлю членство в Объединенной гражданской партии. Это команда честных и умных людей, которая предлагает гражданам реальную альтернативу и программу системных реформ «Миллион новых рабочих мест», в результате этих реформ мы получим честные выборы, настоящий парламент, который работает для людей и перед ними отчитывается, реально независимый суд, который защитит каждого человека в случае произвола государства.

Мария ЭЙСМОНТ.

Фото Геннадия ВЕРАТИНСКОГО.

ЧУЛІ?

За прыгатаваннем школьных абедаў будуць назіраць праз відэакамеры

У Гродзенскай вобласці да пачатку 2019 года ва ўсіх установах агульнай і сярэдняй адукацыі сталоўкі абсталююць відэаназіраннем.

Чыноўнікі ад адукацыі спадзяюцца, што такі кантроль стане эфектыўным метадам, каб супрацьстаяць крадзяжу харчоў і падвысіць дысцыпліну працаўнікоў, якія займаюцца гатаваннем абедаў для студэнтаў і школьнікаў.

Афіцыйна паведамлялася, што летась у гэтай галіне да дысцыплінарнай адказнасці ў вобласці былі прыцягнуты звыш 400 службовых асоб, каля 20 чалавек былі звольнены за факты крадзяжу харчоў са школьных сталовак.

З пачаткам 2019 хода ва ўстановах адукацыі плануецца навесці парадак з закупкамі прадуктаў для сваіх сталовак. Сёлета з 28 вытворцаў харчовай прадукцыі ў Гродзенскай вобласці толькі восем удзельнічалі ў аўкцыёнах і прапаноўвалі сваю прадукцыю. Астатнія часцей за ўсё рэалізоўваюць яе праз пасрэднікаў, што значна адбіваецца на коштах. Гэтую сітуацыю таксама вырашылі змяніць.

І яшчэ адна навінка мае з'явіцца ў школьных сталоўках з пачаткам новага года: сталоўкі ўстаноў адукацыі вобласці маюць намер перайсці на электроннае меню і безнаяўны разлік за харчаванне.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

З ПЕРШЫХ ВУСНАЎ

Ігар КОМЛІК:

«Пра шампанскае на Новы год трэба забыць»

Фігурант "справы прафсаюзаў" расказаў "Народнай Волі", што яму забаронена з 19 снежня.

Нагадаем, што суд прызнаў лідараў прафсаюза РЭП **Генадзя Фядыніча** і **Ігара Комліка** вінаватымі ў парушэнні ч.2 арт.243 Крымінальнага кодэкса Рэспублікі Беларусь (ухіленне ад выплаты падаткаў у буйным памеры) і прыгаварыў кожнага да 4 гадоў "хатняй хіміі" з забаронай займаць кіруючыя пасады тэрмінам на 5 гадоў.

На гэтым тыдні Ігара Комліка выклікалі ва Упраўленне выканання пакаранняў Фрунзенскага раёна Мінска і азнаёмілі з умовамі адбыцця абмежавання волі. Абмежаванні пачалі дзейнічаць з 19 снежня.

– Узялі падпіску, што азнаёмлены з правіламі, – кажа **Ігар Комлік.** – І трэба сказаць, што абмежаванняў даволі шмат. Напрыклад, у працоўныя дні абавязаны знаходзіцца ва ўласнай кватэры кожны дзень з 21.00 да 6 гадзін раніцы. У выходныя і святочныя дні наогул не маю права выходзіць з дома, таму нават прагуляцца па вуліцы не магу.

Таксама не маю права наведваць фізкультурна-аздараўленчыя, масава-спартыўныя і культурныя мерапрыемствы, дзе прадаюць спіртныя і слабаалкагольныя напоі. Мяне нават папярэдзілі, што можна ездзіць на веласіпедзе па вуліцы, але не набліжацца да месцаў, дзе, скажам, прадаюць разліўное піва.

– На якой адлегласці трэба трымацца ад бочкі з півам?

– Пра гэта, на жаль, не паведамілі. Але сказалі, што родныя да мяне могуць прыйсці ў госці, а мне да іх нельга. Напрыклад, я жыву ў адным доме з сынам, але ў розных кватэрах. Сын можа наведваць мяне, а я да яго схадзіць не магу.

Увогуле, трэба адзначыць, што



Дэпартамент выканання пакаранняў вельмі клапоціцца пра маё здароўе, бо чатыры гады забаронена ўжываць алкаголь. Нават на Новы год нельга падняць келіх з шампанскім, бо ў любы час дня і ночы дахаты да мяне можа завітаць любы прадстаўнік міліцыі. Дарэчы, інспектар ва Упраўленні выканання пакаранняў параіла мне назапасіць прадуктаў на чатыры дні навагодніх святаў, бо схадзіць у магазін не будзе магчымасці.

– Вы працуеце прадстаўніком прафсаюза РЭП па Мінску і Мінскай вобласці, а значыць, працоўныя абавязкі прадугледжваюць службовыя камандзіроўкі…

– Выезд за межы сталіцы забаронены. Тры месяцы будуць прыглядацца да маіх паводзін, а затым, калі ўсё добра, у якасці заахвочвання могуць і дазволіць выехаць з горада. Але ў любым выпадку на гэта трэба будзе браць спецыяльны дазвол.

Я, дарэчы, запытаўся ў інспектара, як Дэпартамент выканання пакаранняў ставіцца да працоўнай тэрапіі. Меў на ўвазе магчымасць з'ездзіць на лецішча. Аказваецца, і туды мне пакуль нельга, хаця часам трэба нешта і прывезці, і папрацаваць там.

– Ці можна вам удзельнічаць у акцыях, якую будзе арганізоўваць ваш прафсаюз?

– Здаецца, ніякай забароны няма, калі мерапрыемства дазволена. Калі ж акцыя несанкцыянаваная, то могуць прыцягнуць да адказнасці. Тры такія парушэнні – і будуць судзіць ужо па крымінальным артыкуле.

Алесь СВЯТЛАНІЧ.

P.S. *Як паведаміў учора іншы фігурант "справы прафсаюзаў" Генадзь Фядыніч, яго пакуль не выклікалі ва Упраўленне выканання пакаранняў, а таму і абмежаванняў яшчэ няма.*

ПОСТСКРИПТУМ

Вышли пообщаться, подышать воздухом

Так объясняют пенсионеры ОАО «Беларуськалий» очереди за новогодними подарками от предприятия.

Фото, на котором запечатлены пенсионеры ОАО «Беларуськалий», стоящие в длинной очереди за новогодними подарками, несколько дней назад облетело многие интернет-ресурсы и социальные сети. Сам Александр Лукашенко отреагировал. Не понравилось, что в очередь людей за подарками выстроили. Оно и правильно: что тут хорошего, когда очереди создают, да еще из пенсионеров, да еще и для получения новогодних подарков?

Корреспондент «Народной Воли» поговорила с двумя пенсионерами этого предприятия и услышала, что в данном случае, хоть фото впечатляет и навевает критические размышления, но на самом деле не все так однозначно, и вообще у самих пенсионеров, как они уверяли, возмущаться в данном случае причины нет.

– Подарки нам всегда выдают хорошие, и никогда не было, чтобы кому-то подарок не достался, – рассказывает пенсионерка ОАО «Беларуськалий» Таисия Андреевна Клишевич. *– В этом году пакет подарочный оформлен в виде кораблика. Необычно, нестандартно, красиво.*

Да, в первые дни выдачи подарков бывают очереди за ними. Просто некоторым не терпится скорее получить, хотя до Нового года вон еще сколько дней, а подарки выдают и после 1-го числа. Даже через месяц-два могут человеку отдать подарок, если по какой-то причине он не пришел за ним раньше. Еще насчет того, почему народ готов в очереди стоять. Пенсионеры общаются, старых знакомых встречают, новостями делятся. Так-то и многим ходить особо некуда. Это летом дачи, а зимой все больше по домам сидим. И еще учтите, что пенсионеров у ОАО «Беларуськалий» много. Где-то около 10 тысяч. Мы понимаем, что за один-два-три дня подарки не раздашь.

Высказал свое мнение и бывший шахтер Валерий Александрович Горбацевич:

– Не вижу проблемы с подарками. Все получат. Очереди есть, но, думаю, людей они не сильно напрягают. Кого напрягают, тот через несколько дней после ажиотажа придет и получит. Некоторые, насколько слышал от людей, даже с удовольствием стоят. Из-за общения. Вот чего не хватает пенсионерам, так это общения. Особенно зимой. Поэтому и радуются люди встрече друг с другом даже в таких очередях.

Вообще, новогодние подарки от своих предприятий получают в Солигорске многие пенсионеры. Но есть и такие, которые остаются без поздравлений от бывших работодателей.

Как, например, Нина Васильевна Адамович. Она ушла на пенсию из треста столовых и ресторанов.

– Развалился трест, какие подарки! – замечает она. *– Но я не переживаю. Что есть, то есть.*

Не получает новогодних подарков от предприятия, где работала, и Любовь Борисовна Ковальчук. Она пенсионерка с 2002 года. Ушла на заслуженный отдых из ЖКХ.

– Помню, что один раз подарок давали к Дню пожилого человека, а один раз – к Новому году. И все. Больше меня не вспоминали. Денег, наверное, у них нет.

Лариса НАСАНОВИЧ.

Народная Воля http://www.nv-online.info
21 СНЕЖНЯ 2018 г.

МЕДДАВЕДКА

На агляд пацыента 18 хвілін

З 1 студзеня ў Беларусі змяняюцца часы прыёму пацыентаў у паліклініках. Сёння, як вядома, участковы тэрапеўт мае толькі 15 хвілін на агляд пацыента. Але ў Беларусі ўчастковыя тэрапеўты актыўна замяняюцца ўрачамі агульнай практыкі. К 2020 году тэрапеўтычных аддзяленняў у паліклініках увогуле не застанецца, а прыёмы будуць весці ўрачы агульнай практыкі. Іх функцыі значна шырэйшыя, чым у тэрапеўтаў. Такія спецыялісты мусяць аказваць медыцынскую дапамогу не толькі ў галіне тэрапіі, але і неўралогіі, отарыналарынгалогіі, афтальмалогіі, хірургіі. Таму Міністэрства аховы здароўя адмысловай пастановай і ўвяло новыя галіновыя нормы часу для ўрача агульнай практыкі.

Так, з 1 студзеня 2019 года ўрачам агульнай практыкі, якія абслугоўваюць дарослае насельніцтва, на першасны прыём будзе адведзена 18 хвілін (раней 15 хвілін), на прафілактычны агляд у выдзеленыя дні ці гадзіны (у паліклініцы і на выездах) – 13 хвілін (раней 10 хвілін). Спецыялістам, якія абслугоўваюць дарослае і дзіцячае насельніцтва, на першасны прыём будзе адведзена 20 хвілін (раней 15 хвілін), прафілактычны агляд у выдзеленыя дні ці гадзіны (у паліклініцы і на выездах) – 15 хвілін (раней 10 хвілін).

Але ж ці можна казаць, што ва ўрача агульнай практыкі пры тых функцыянальных абавязках, якія на яго ўскладзены, будзе больш часу на пацыента, калі прыем падоўжыўся толькі на 3 хвіліны?!

Вольга ГРЫНЯВІЦКАЯ.

РАКУРС

Чэргі да шасці гадзін…

Чэргі ў памежных пунктах пропуску на мяжы Беларусі з Польшчай у перадсвяточныя дні не змяншаюцца. Беларусы, якія едуць на святочныя закупы ў суседнюю краіну, распавядаюць, што стаяць у чарзе даводзіцца ад трох да шасці гадзін.

За апошнія тры месяцы 2018 года праз пункты пропуску Гродзенскай рэгіянальнай мытні праехалі на 117 тысяч аўтамабіляў болей, чым летась у гэты ж перыяд. Паводле дадзеных Гродзенскай рэгіянальнай мытні, у сярэднім за суткі мяжу перасякаюць каля 9 тысяч легкавых аўтамабіляў, 3500 грузавых і больш за 250 аўтобусаў.

Ажыятаж з паездкамі за мяжу, паводле меркавання саміх беларусаў, якія стаяць у чэргах на памежных пераходах, звязаны са зменамі лімітаў бязмытнага ўвозу тавараў у Еўразійскі эканамічны саюз. Да Новага года яшчэ дзейнічае норма, паводле якой раз на тры месяцы можна ўвезці тавар коштам у 1500 еўра і вагой 50 кілаграмаў.

З 1 студзеня 2019 года, паводле рашэння Еўразійскай эканамічнай камісіі, норма правозу тавару зменіцца: кошт тавару не павінен будзе перабольшваць 500 еўра і вага – 25 кг на асобу. Гэта ліміт для тых, хто ездзіць за мяжу не часцей аднаго раза ў тры месяцы. Для тых, хто наведваецца туды часцей, – 300 еўра і 20 кілаграмаў. У любым выпадку тэлевізар з вялікай дыяганаллю за мяжой ужо не купіш.

Аляксей МІХАЛЁЎ.

СУД ДЫ СПРАВА

Штраф за паласатую робу

Ленінскі раённы суд Гродна аштрафаваў пенсіянера Мікалая Саляніка (на фота) на 40 базавых велічынь (980 рублёў). Судзілі за тое, што прыйшоў у суд у паласатай робе кшталту той, у якую раней апраналі вязняў, і з металічным ашыйнікам, на ланцугу якога трымалася калодка. У руках пенсіянер нёс тры выданні Канстытуцыі Беларусі.



У такім выглядзе ў суд Салянік з'явіўся яшчэ напрыканцы лістапада. Так ён дэманстраваў сваё стаўленне да адміністрацыйнага пратакола, які ў адносінах да Саляніка і яго паплечніка па Аб'яднанай грамадзянскай партыі Аляксандра Лаўрэнцьева склалі міліцыянеры за перформанс 7 лістапада. У той дзень грамадскія актывісты ішлі па цэнтральнай вуліцы Гродна з плакатам "Долой самодержавие!". Міліцыянты палічылі, што гэта несанкцыянаваны пікет.

Учора ў судзе супраць Саляніка сведчылі 5 міліцыянтаў. Толькі адзін з іх, які складаў пратакол, зазначыў, што сваімі дзеяннямі Салянік выказваў незадаволенасць судовай сістэмай і прыцягваў увагу людзей, чым і парушыў заканадаўства аб правядзенні масавых мерапрыемстваў, бо, маўляў, не меў на гэта дазволу. Астатнія ацэнкі дзеянням Саляніка не давалі, а толькі сведчылі, што бачылі, як ён прыйшоў у суд у такім выглядзе і аб нечым размаўляў на вуліцы з людзьмі. Сам Салянік спрабаваў напачатку дамагчыся ў міліцыянта, які складаў на яго пратакол, адказу на пытанне, які артыкул закона забараняў яму ў такім выглядзе з'яўляцца ў суд, але так і не атрымаў яго. Спрабаваў задаць гэтае пытанне суддзі, але з тым жа вынікам.

Пытанні па сутнасці сведкам ён практычна не задаваў, патлумачыўшы суду, што і так суд не бярэ пад увагу ніякіх ягоных аргументаў. *"Вы падводзіце рашэнне суда пад пратакол, то навошта тады задаваць пытанні гэтым сведкам?"* – заявіў Салянік суддзі.

Пасля разгляду адміністрацыйнай справы Салянік сказаў "Народнай Волі", што адпрацаваў на дзяржаву больш за 40 год, а цяпер, каб *"выплаціць штраф у памеры 980 рублёў са сваёй пенсіі, вымушаны амаль тры месяцы нічога не есці"*.

Міхал КАРНЕВІЧ.

«КРУГЛЫ СТОЛ»

«Курапацкі помнік з без'языкім звонам адпавядае нашаму часу»

*30 гадоў у дзяржавы не даходзілі рукі, каб ушанаваць памяць бязвінна загінуўшых у Курапатах, выканаць яшчэ савецкага часу ўрадавую пастанову аб мемарыялізацыі ўрочышча. 30 гадоў там стыхійна ствараўся народны мемарыял, вакол якога неаднойчы ўспыхвалі агмені ледзь не грамадзянскай вайны. 30 гадоў межы ўрочышча скарачаліся – то пад наступам кальцавой дарогі, то пад націскам дзіўных рэстаратараў, якія з падазронай упартасцю сляпіцаю лезлі менавіта ў Курапаты. І вось нарэшце дзяржава пачула голас грамадства і ўсталявала – праз пасрэдніцтва Федэрацыі прафсаюзаў – помнік ахвярам палітычных рэпрэсій. Але гэта не прынесла чаканай згоды. Чаму? На гэта пытанне за «круглым сталом» паспрабавалі адказаць культуролаг **Вацлаў Арэшка**, грамадскі актывіст **Марат Гаравы**, мастакі **Генадзь Драздоў** і **Аляксей Марачкін**, скульптары **Генадзь Лойка** і **Алесь Шатэрнік**, кінарэжысёр **Вольга Мікалайчык** і аўтары ўсталяванага помніка **Вольга Нячай** і **Сяргей Аганаў**.*

– Шаноўнае спадарства, дзякуй вам, што адгукнуліся на запрашэнне паўдзельнічаць у нашым «круглым стале»! Як выглядае, нядаўна ўсталяваны ў Курапатах афіцыйны помнік успрыняты ў грамадстве неадназначна. Да таго ж па-ранейшаму працягваецца супрацьстаянне каля адчыненага там рэстарана. Давайце абмяркуем сітуацыю, выкажам сваё бачанне далейшага развіцця падзей.

Аляксей Марачкін: – Курапаты – наш сакральны сімвал. Гэта зразумела ўсім, апрача беларускай улады. Але і ёй пад ціскам грамадскасці не было куды падзецца – паставіла нарэшце свой помнік. Толькі праблемы засталіся. Іх застаецца як мінімум тры. Першая – мемарыялізацыя ў самым цэнтры Курапатаў, на гэтак званай Галгофе, дзе ўжо ёсць памятны камень, дзе нядаўна з'явіўся помнік-капліца. Другая праблема – крыжы па перыметры. І трэцяя – народны супраціў, пікеты каля рэстарана «Поедем поедим».

Марат Гаравы: – Удакладню: для нас Курапаты – сімвал пакутніцтва, сімвал змагання, сімвал апошняй у XX стагоддзі хвалі нацыянальнага Адраджэння. І – народны мемарыял. Народ там забівалі, народ тое месца адкрыў, народ ставіў крыжы, народ бараніў. З усяго гэтага мы і сыходзім. Мы сабралі грамадскі аргкамітэт конкурсу па мемарыялізацыі Курапатаў, журы ўзначаліў Аляксей Марачкін. Мы правялі выставу, падвялі вынікі. На конкурс былі дасланы 44 праекты. Адзін з самых цікавых праектаў прадставіў польскі Інстытут нацыянальнай памяці. Яны размясцілі музей гісторыі Курапатаў на падземным паверсе на глыбіні 2,5 м (сярэдняя глыбіня пахаванняў), на сярэднім паверсе – экуменічную капліцу, а на верхнім – аглядавую пляцоўку. І злучылі ўсе тры паверхі светлавым ліхтаром – свет памерлых са светам жывых. А паэт-мысляр Алесь Разанаў прапанаваў на ўваходнай браме напісаць радкі: «Словы ацiхлi: у цішыню стукае сэрца…»

– Дык ці вызначылі вы праект-пераможцу?

Гаравы: – Мы хацелі, каб мастакі зрабілі мемарыял, прысвечаны грамадскаму пакаянню. Гэта была і ёсць наша канцэпцыя. Не прымірэння катаў з забойцамі, а пакаяння ўсяго грамадства за тое, што яно такое дапусціла. Мы правялі першы этап конкурсу, двойчы зладзілі ў Палацы мастацтва выставу «Праўда пра Курапаты: факты, дакументы, сведчанні». Нягледзячы на мноства праектаў, журы на чале са спадаром Марачкіным вырашыла, што канчатковыя вынікі падводзіць рана. Тэма складаная, шматзначная. Нездарма французы кажуць: каханне – дзіця свабоды. Так і творчасць не можа быць дзіцём насілля. А тут дзяржава за паўтара-два месяцы ўсё вырашыла… Помнік паставіць – не стог абы-як скідаць.

– А ці кантактавалі вы з Міністэрствам культуры, якое абвяшчала свой конкурс?

Гаравы: – Вясной мінулага года мы хадзілі да міністра культуры, яшчэ Барыса Святлова. Ён прапаноўваў нам далучыцца да іхняга конкурсу. Мы сказалі: не, у такой спешцы мы нічога добрага не зробім. Дзе імёны загубленых? Адкрыйце іх. І давайце дамовімся, што конкурс павінен быць празрысты, з грамадскім абмеркаваннем, з улікам ужо зробленага. Бо, нагадаю, на пачатку 1990-х таксама адбыўся конкурс, тады журы ўзначальваў народны мастак Васіль Шаранговіч. І што? Дзяржава прыслухалася да нашага меркавання? Не.

Вольга Нячай: – Спадар Гаравы гаварыў пра наш помнік як знак прымірэння. Мы лічым, што ніякага прымірэння з рэпрэсіямі не можа быць увогуле. І мы як аўтары не ставілі перад сабой мэту зрабіць помнік, які прымірыў бы катаў і ахвяр. Як з гэтым можна прымірыцца? Калі брат брата арыштоўваў, сын на бацьку даносіў. Калі план па знішчэнні людзей выконвалі. Не хапае – чалавека ў машыну і павезлі... Наша сям'я таксама пацярпела ад рэпрэсій. Калі мы хадзілі ў Мінкультуры, нам там сказалі адназначна: вы робіце помнік менавіта ахвярам палітычных рэпрэсій 1930–1940-х гадоў. І толькі такую канцэпцыю мы і ўвасаблялі.

Сяргей Аганаў: – Як можна прымірыцца з катам, які страляе ў твайго дзеда, у бацьку, у маці? У Курапатах жа не проста стралялі «ворагаў народа», «польскіх шпіёнаў» ці яшчэ каго. Там забівалі мірных людзей. На помніку адназначна патлумачана, каму ён усталяваны. На адмысловай шыльдачцы па-беларуску, а неўзабаве павінны з'явіцца яшчэ тры – на польскай, на рускай і на ідыш. Яны цяпер якраз выпрацоўваюцца, прычым за наш з Вольгай кошт, бо гэта была наша ініцыятыва.

– Вы гаворыце пра надпіс «Ахвярам палітычных рэпрэсій 1930–1940-х гадоў», які змешчаны на прыкручанай шыльдзе. Але яе можна адкруціць.

Вольга Нячай: – У тым і справа, што адкруціць яе немагчыма. Ні адкруціць, ці адарваць. Яна так прымацавана, што зняць яе без пашкоджання самога помніка нельга.

Вольга Мікалайчык: – У Курапатах існуе народны мемарыял – помнік народу, бязвінна забітаму, ад народа жывога. Вось што галоўнае. І калі без абмеркавання з грамадскасцю, якая гадамі апекавалася Курапатамі, прывезлі і паставілі гэтую гаргару, там адразу ўсё парушылася. Там глядзелася ўсё абсалютна гарманічна, а помнік – нешта чужароднае, ён занадта вялікі.

Вацлаў Арэшка: – Ён зроблены цалкам у савецкай стылістыцы. Калі прыбраць з яго шыльду, ён можа быць помнікам ахвярам нацызму, ахвярам капіталізму, загінуўшым савецкім танкістам – каму заўгодна. Гэта, на маю думку, мякка кажучы, прахадны твор. Месца гэтаму помніку не на Галгофе, ён не павінен займаць цэнтральнае месца. Чамусьці аўтары вырашылі, што кантакт з уладамі для іх больш важны, чым кантакт з грамадскасцю.

Генадзь Драздоў: – Ва ўсіх краінах постсавецкай прасторы месцы масавых рэпрэсій даўно ўшанаваны. Беларусь заставалася адзінай краінай, якая не мела свайго помніка. І вось нібыта мае. Але немагчыма за такі кароткі час зладзіць якасны конкурс, гэта проста нерэальна. Спешка ў такой справе заўсёды прывядзе да сырых вынікаў. Так і сталася. Мінкультуры запрашала і нас паўдзельнічаць у конкурсе. Але мы выставілі ўмову – адкрыць архівы, назваць прозвішчы расстраляных. Бясспрэчна, што ў архівах КДБ яны ёсць.

– Вы патрабавалі ад Міністэрства культуры адкрыць архівы КДБ?

Драздоў: – Мы патрабавалі ад дзяржавы – праз Мінкультуры. І яшчэ адзін момант. Калі праводзіўся наш конкурс, ладзілася ананімнае апытанне. І праект Сяргея Гумілеўскага набраў больш за 2000 галасоў, а праект Аганава і Нячай – амаль у два разы менш. Але ўлады адкінулі праект Гумілеўскага. Фактычна грамадскага абмеркавання ўсталяванага помніка не было, дзяржава проста выкарыстала тых скульптараў, якія ўзяліся літаральна за паўтара месяца зрабіць помнік. Яны дапамаглі дзяржаве, якая ўсталявала яго ў Курапатах і, падобна, ужо забылася пра яго. З тым помнікам яшчэ трэба працаваць, там ёсць някепская задумка, але ён сыры.

Алесь Шатэрнік: – Я ўдзельнічаў у шмат якіх конкурсах, набіў нямала шышак, і ў мяне да ўсталяванага помніка, прызнаюся, было адмоўнае стаўленне. Пакуль я яго не пабачыў на свае вочы. Калі ж прыйшоў у Курапаты і пабачыў, то змяніў свой погляд. Лічу, што ў Вольгі і Сяргея атрымаўся твор мастацтва. Ведаю, ім ніхто не дыктаваў, што і як рабіць. Ні Аляксандр Лукашэнка, ні Зянон Пазьняк. Помнік надзвычай удала ўпісаўся ў пейзаж.. Сасна ўнізе чорная, пасля пачынае, як свечка, гарэць... Я, шчыра кажучы, пазайздросціў калегам. І, заўважце, помнік не лезе ў цэнтр, ён збоку. Але сёе-тое там варта было б дадаць. Вось калі б там зрабіць сем званоў. У мяне ёсць эскіз, зроблены два гады таму.



– Дык помнік добры, трэба толькі дадаць нейкія элементы?

Шатэрнік: – На маю думку – так.

– Помнік усталяваны, але афіцыйнага адкрыцця так і не адбылося. Як вы лічыце, чаму?

